# БЕЛАРУСКАЯ СЯМ'Я 50–60-Х ГГ. XX СТ. У ЛЮСТЭРКУ ПЕРЫЁДЫКІ І ЭТНАЛОГІІ

***Н. Я. Луйгас***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*Luihas@bsu.by*

У рабоце прааналізаваны супольны дыялог паміж журналістамі і навукоўцамі па праблеме беларускай сям'і ў перыяд 50–60-х гг. XX ст. Выяўлены асноўныя напрамкі адлюстравання тэмы ў перыёдыцы і навуцы. Паказана, як упершыню адбылося станаўленне дыферэнцыяванага падыходу ў даследаваннях гарадской і сельскай сям'і, акрэслена кола такіх пытанняў, як уплыў Вялікай Айчыннай вайны на побыт насельніцтва, новыя з'явы ў сямейным побыце пасляваеннага перыяду, фарміраванне сацыялістычнага ладу жыцця ў грамадстве і сям'і.

***Ключавыя словы:*** гісторыя сям'і; сродкі масавай інфармацыі; этналогія; перыёдыка.

# БЕЛОРУССКАЯ СЕМЬЯ 50–60-Х ГГ. XX В. В ЗЕРКАЛЕ ПЕРИОДИКИ И ЭТНОЛОГИИ

***Н. Е. Луйгас***

*Белорусский государственный университет,*
*ул. Кальварийская, 9, 220004, г. Минск, Республика Беларусь,*
*Luihas@bsu.by*

В работе проанализирован совместный диалог между журналистами и учеными по проблеме белорусской семьи в период 50-60-х гг. XX в. Выявлены основные направления отражения темы в периодике и науке. Показано, как впервые произошло становление дифференцированного подхода в исследованиях городской и сельской семьи, очерчен круг таких вопросов, как влияние Великой Отечественной войны на быт населения, новые явления в семейном быту послевоенного периода, формирование социалистического образа жизни в обществе и семье.

***Ключевые слова:*** история семьи; средства массовой информации; этнология; периодика.

Сям’я, яе стан, праблемы і перспектывы заўжды знаходзіліся ў цэнтры ўвагі публіцыстаў і даследчыкаў. Беларускія навукоўцы даволі часта звярталіся да матэрыялаў перыядычнага друку па тэме сям’і. Навідавоку арганічнае спалучэнне працы журналіста як першакрыніцы адлюстравання рэальнага жыцця і этнолага як даследчыка тагачаснага стану беларускага грамадства і сямейнага асяродку ў прыватнасці. Не дзіўна, што тэмы, якія ўзнімаліся на старонках перыядычнага друку ў 50-60-х гг. ХХ ст., натхнялі навукоўцаў на этна-сацыялагічныя даследаванні. І наадварот, выдадзеныя этналагічныя працы даследчыкаў падштурхоўвалі тагачасных журналістаў актыўна далучацца да навуковага і публіцыстычнага дыялога па гэтай тэме, рабіць спасылкі альбо выкарыстоўваць даследаванне ў якасці інфаповада ў сваіх публікацыях на старонках газет і часопісаў. Цікава прааналізаваць на дакладных прыкладах, якім чынам журналісты і этнолагі распрацоўвалі агульную тэму ў навуцы і перыёдыцы.

Першай спробай выяўлення новых з’яў у сямейным побыце пасляваеннага перыяду з’яўляецца даследаванне змяненняў у сем’ях калгаса «Бальшавік» Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці [1].

М. Я. Грынблат і Л. А. Малчанава сканцэнтравалі ўвагу на выяўленні асноўных рыс, якія прынцыпова адрозніваюць новую мадэль сялянскай сям’і ад старой. Дзеля тэрміналагічнай вызначанасці аўтары ўводзяць у навуковы зварот паняцце сацыялістычнага тыпу сям’і – калгасная сям’я.

Новымі з’явамі ў сямейным быце калгаснікаў даследчыкі-этнолагі называюць наступныя: змяненне сацыяльна-эканамічнай асновы сялянскай сям’і, дэмакратызм унутрысямейных стасункаў, распрыгоненне жанчыны-сялянкі, трансфармацыя сацыяльна-эканамічнай прыроды прымацтва. Тут закранаюцца таксама пытанні выхавання, адукацыі школьнікаў як дзяржаўна-сямейныя задачы.

А. І. Залескі ўзняў новую ў беларускай навуцы праблему даследавання – быт сялян (у тым ліку і сямейны) у партызанскім краі [2; 3]. Крыніцазнаўчую базу яго манаграфіі склалі матэрыялы, сабраныя ў этнаграфічных экспедыцыях, а таксама падпольныя бальшавіцкія газеты «Звязда», «Чырвоная змена», «Кліч Радзімы», кнігі ўспамінаў удзельнікаў партызанскага руху. Тут закранаюцца такія пытанні, як змяненне памераў і складу сям’і за перыяд Вялікай Айчыннай вайны, ілюструецца складанасць працэсаў, што былі звязаны са змяненнем

колькаснага складу сям'і, характарызуюцца ўзаемаадносіны паміж членамі сям'і, сваякамі, староннімі людзьмі (бежанцамі) і інш.

Аўтар закранае такія пытанні, як структура сям'і і сямейных адносінаў, роля жанчыны-главы сям'і, узаемаадносіны паміж сваякамі, гадаванне і выхаванне дзяцей, роля дзяржавы ў арганізацыі выхаваўчых і навучальных установаў для дзяцей воінаў Савецкай Арміі і партызанаў Айчыннай вайны.

Праблема даследавання працэсу фарміравання сацыялістычнага побыту сялянства знайшла вырашэнне ў шэрагу прац 60-х гг. XX ст. Аўтарскі аналіз новых з'яў, што пачалі нараджацца ў грамадскім і сямейным побыце беларускіх калгаснікаў, правяла Г. І. Дулеба [4]. Аб'ектам вывучэння абраны 4 калгасы Барысаўскага раёна Мінскай вобласці. Метадалагічны арсенал Г. І. Дулебы ўключаў два асноўныя метады вывучэння – назіранні-гутаркі з інфарматарамі і анкетнае абследаванне 581 сям'і.

Аўтар вызначыла карэнныя змены ў сямейным побыце калгаснікаў Барысаўшчыны: змяненне становішча галавы сям'і, раўнапраўе жанчыны, фарміраванне дэмакратычных унутрысямейных стасункаў, акрэслены пачатак мадэрнізацыі ў сферы сямейных звычаяў і абрадаў.

Асобную брашуру Г. І. Дулеба прысвяціла асвятленню пытання становішча жанчыны на Беларусі ў да- і паслякастрычніцкі перыяды [5]. Значную ўвагу аўтар адводзіць фактычнаму паказу ролі маладой дзяржавы і адукацыі ў працэсе павышэння аўтарытэту жанчыны ў грамадстве, разбурэння стэрэатыпных поглядаў на падначаленае становішча жонкі ў сям'і.

Сучасны шлюб і вяселле рабочых становяцца прадметам вывучэння У. М. Іванова [6]. Крыніцазнаўчую базу склалі аўтарскае даследаванне 448 сем'яў горада Мінска, матэрыялы перыядычных выданняў, а таксама статыстычная апрацоўка кніг рэгістрацыі шлюбаў Кастрычніцкага раёна сталіцы за 1956 г. Аўтар справядліва адзначае сутнасную змену шлюбу як саюза няроўных у дакастрычніцкі перыяд і юрыдычнае раўнапраўе мужчыны і жанчыны, пацверджанае савецкім шлюбным заканадаўствам.

Комплекснае даследаванне побыту рабочых горада Мінска прадстаўлена ў абагульненай працы У. М. Іванова [7]. Аб'ектам вывучэння былі абраны сем'і працоўных вядучых прадпрыемстваў сталіцы: чыгуначнага вузла, завода «Бальшавік», завода імя Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Аўтар выкарыстаў метад стацыянарнай палявой работы, дзе асноўная ўвага надавалася асабістым назіранням, размовам, прыёмам непасрэднага вывучэння працоўных сем’яў з выкарыстаннем пасямейнай карткі і аўтарскай пасямейнай анкеты [7].

У. М. Іваноў закранае такія пытанні, як шлюб, віды вяселляў, форма сям’і, колькасны склад, унутрысямейныя адносіны, новая мараль, грамадзянскія інавацыі ў сямейных звычаях і абрадах (радзіны, вяселле, пахаванне), культурны ўзровень працоўных.

Праблема неэфектыўнага выкарыстання жаночых працоўных рэсурсаў у вытворчасці, звязаная з бытавой няроўнасцю жанчыны ў сям’і, узнята ў артыкуле В. М. Ткачэнкі «Аб шляхах ліквідацыі рэшткаў бытавой няроўнасці жанчын», надрукаваным у навуковым часопісе «Весці АН БССР» у 1963 г. [8]. Цікавую па змесце і ўдалую па форме выканання, сугучную ідэю вывучэння характару маладой сям’і, падаў У. М. Іваноў у артыкуле «Рэшткі бытавой няроўнасці жанчыны і меры па найхутчэйшай іх ліквідацыі» [9]. Адказы на пытанні, дасланыя чытачамі газеты «Знамя юности» дазволілі даследчыку зрабіць этнаграфічную мазаіку, якая па змесце значна пашырае і паглыбляе праблему нераўнапраўнага размеркавання сямейных абавязкаў сужэнцаў.

Такім чынам, на працягу 50-60-х гг. XX ст. адбылося пасляваеннае ўзнаўленне даследаванняў па сямейнай праблематыкі ў сродках масавай інфармацыі і этналогіі. Найбольш актыўна ўключыліся ў гэты працэс выданні «Звязда», «Чырвоная змена», «Кліч Радзімы», «Знамя юности». Матэрыялы, выдадзеныя на старонках газет, склалі крыніцазнаўчую базу для грунтоўных этна-сацыялагічных даследаванняў. Упершыню адбылося станаўленне дыферэнцыяванага падыходу ў вывучэнні гарадской і сельскай сям’і. Этнолагі звярнуліся да такіх пытанняў, як уплыў Вялікай Айчыннай вайны на побыт насельніцтва, новыя з’явы ў сямейным побыце пасляваеннага перыяду, фарміраванне сацыялістычнага ладу жыцця ў грамадстве і сям’і, стасункі паміж сужэнцамі.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Грынблат М. Я.*, *Малчанава Л. А.* Новыя з’явы ў быце калгаснай вёскі. Сямейны быт калгаснікаў // Беларускі этнаграфічны зборнік. Вып. 1. Мінск: АН БССР, 1958. С. 67–80.
2. *Залескі А. І.* Быт беларускіх сялян у партызанскім краі. Мінск: АН БССР, 1960. 210 с.

3. *Залескі А. І.* Аб некаторых з'явах у пасляваенным сямейным быце беларускіх калгаснікаў // Беларускі этнаграфічны зборнік. Вып. 1. Мінск: АН БССР, 1958. С. 122-140.
4. *Дулебо А. Н.* Современный общественый и семейный быт белорусскнх колхознннков. Автореф. дис. ... канд. ист. наук 07.00.07. Минск: АН БССР, 1966. 24 с.
5. *Дулебо А. Н.* Изменение положения белорусской женщины-крестьянки за годы Советской власти. Минск: Мин. обл. орг. о-ва «Знание», 1969. 24 с.
6. *Іваноў У. М.* Сучасны шлюб і вяселле ў рабочых // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1959. № 2. С. 160–166.
7. *Иванов В. М.* Современный быт рабочих города Минска. Автореф. дис. ... канд. ист. наук 07.00.07. Киев: АН УССР, 1961. 21 с.
8. *Ткачэнка В. М.* Аб шляхах ліквідацыі рэшткаў бытавой няроўнасці жанчын // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1963. № 4. С. 20–27.
9. *Іваноў У. М.* Рэшткі бытавой няроўнасці жанчын і меры па хутчэйшай іх ліквідацыі // Пытанні беларускай этнаграфіі, фалькларыстыкі і тапанімікі. Мінск: АН БССР, 1967. С. 20–29.